Весці БДПУ. Серыя 2. 2019. № 2. С. 26–34

УДК 94:27-442.47(=133.1,=112.2)“16”

# КАМЕНТАРЫІ ФРАНЦУЗСКІХ І НЯМЕЦКІХ БАГАСЛОВАЎ XVII ст. АБ ІНСТЫТУЦЕ ПОСТУ Ў ТАГАЧАСНАЙ ХРЫСЦІЯНСКАЙ ЦАРКВЕ

**У. М. Завальнюк,**
*кандыдат гістарычных навук,*
*дэкан-канонік, ксёндз-магістр,*
*настаяцель Мінскага Касцёла*
*Святога Сымона і Святой Алены*

Паступіў у рэдакцыю 08.04.19.

UDC 94:27-442.47(=133.1,=112.2)“16”

# COMMENTS OF FRENCH AND GERMAN THEOLOGIANS OF 17TH CENTURY ON THE INSTITUTION OF FASTING IN THE CHRISTIAN CHURCHH

**U. Zavalnyuk,**
*PhD in History, Dean-Canon,*
*Roman Catholic Priest Master,*
*Abbot of Minsk Cathedral*
*of St. Simon and St. Helena*

Received on 08.04.19.

Разглядаецца развіццё тэмы пасніцтва ў царкоўнай літаратуры Францыі і Германіі XVII ст. У гэты перыяд філасофія працягвала развівацца ў рамках тэалогіі. Яе сэнсам з'яўлялася абгрунтаванне веры. Рэлігійна-тэалагічную форму мелі філасофскія погляды і аргументацыі як у царкоўнай артадоксіі, рэфарматараў Царквы, так і ў апазіцыйных ерэтычных плынях. Тэма пасніцтва разглядалася ў агульным кантэксце багаслоўскіх прац.
Мысліцелі даследуемага перыяду імкнуліся размежаваць веды і веру; прааналізаваць прыроду ведаў; размежаваць віды ведаў і вылучыць узроўні праўдзівасці, якія кожнаму з іх уласцівы.
Рэнесанс і гуманізм XVI ст. развілі тэндэнцыі да секулярызацыі раней прынцыпова царкоўнага свету. У багаслоўі і культуры рэнесанс прымаўся маралістычна, як спосаб самаразвіцця, у кантэксце чаго пазначаліся тэндэнцыі да змены духоўнага жыцця Еўропы як па форме, так і па змесце. Тэма пасніцтва і аскетыкі ў гэты перыяд таксама насіла фрагментарны характар.

*Ключавыя словы:* аскетыка, гістарыяграфія, Заходняя Еўропа, пост, рэлігія, рэфармацыя, Святое Пісанне, Святое Паданне, тэалогія, філасофія, хрысціянства, царква.

The development of the theme of fasting in the church literature of France and Germany of the 17th century is developed. During the above mentioned period, philosophy continued to evolve within the framework of theology. Its meaning was the justification of faith. The philosophical views and argumentation both in church orthodoxy, reformers of the Church, and in opposition heretical movements had religious-theological form. The theme of fasting was developed in the general context of theological works.
The theologians of the period strived to separate knowledge and faith; analyze the nature of knowledge; figure out types of knowledge and highlight the levels of confidence of each of them.
Renaissance and humanism of the 16th century developed a trend towards secularization of a previously fundamentally ecclesial world. In theology and culture, the Renaissance was taken moralistically as a way of self-development, in the context of which tendencies toward a change in the spiritual life of Europe were indicated both in form and in content. The theme of fasting and asceticism in theological works of the given period was also fragmentary.

Keywords: asceticism, historiography, Western Europe, fasting, religion, reformation, Holy Scripture, Holy Tradition, theology, philosophy, Christianity, church.

Рост і ўзмацненне нацыянальнай дзяржаўнасці ў XVI ст. абвастрылі сацыяльна-эканамічнае і палітычнае жыццё ў Еўропе. Свецкія ўлады паступальна, з нарастаннем умешваліся ў царкоўную сферу, што значна дэфармавала непахісныя духоўна-маральныя, сацыяльна-эканамічныя традыцыі. З канца XVI ст. і ўсё XVII ст. супярэчнасці пагражалі перарасці ў адкрыты канфлікт. Даследчыкі гісторыі Царквы лічаць, што менавіта станаўленне нацыянальнай царкоўнасці спрыяла паслабленню хрысціянскай Еўропы, падзенню аўтарытэту Царквы, узмацненню свецкіх улад [1, с. 241].

Значна актывізаваў гэты працэс у разглядаемы перыяд паспяховы прыклад пратэстантаў, якія заклікалі да падпарадкаванасці і паслухмянасці дзяржаве. Шматлікія еўрапейскія князі распаўсюдзілі сваю надзвычайную адміністрацыйную ўладу на ўсе аспекты

Рэпазіторый БДПУ

жыцця і тым самым атрымалі магчымасць ўмешвацца ў царкоўную сферу. У XVI ст. гэта тэндэнцыя ў рознай ступені ахапіла еўрапейскія манархіі.

Нацыянальная царкоўнасць у Францыі была больш небяспечнай для хрысціянскага адзінства. Ідэя дзяржаўнасці, якая ў Францыі вяла да абсалютызму, рэалізавалася кардыналамі Рышэлье (1585–1642) і Мазарыні (1602–1661). Французская дзяржава, нягледзячы на яе вернасць каталіцкаму веравызнанню, у царкоўных пытаннях паступальна стала сама вызначаць свае патрэбы. У гісторыі хрысціянства ў Францыі такая палітычная практыка атрымала назву галіканізм [1, с. 242].

Адзначым, што гісторыя хрысціянскай Царквы ўвогуле, а багаслоўя ў прыватнасці разлядаемага перыяду дэталёва вывучалася ў еўрапейскай і расійскай гісторыяграфіях: Морыс дэ Вульф [2], Фрэдэрык Коплстан [3], Дж. Рэале, Д. Антысеры [4], Б. Расел [5], Й. Лорц [1], Гі Бедуэл [6], Е. Гергей [7], Леапольд фон Ранке [8], В. В. Сіманаў [9], Г. А. Смірноў [10], М. Карэлін [11], А. Ц. Ярмішын [12] і інш. Але адзначым, што постніцтва і аскетыкі ў каментарыях багасловаў не знайшлі адлюстравання ў працах, прысвечаных як гісторыі Еўропы XVII ст., так і гісторыі багаслоўя.

На думку гісторыкаў Царквы, галіканізм стрымліваў уплыў папства на сацыяльна-палітычнае і духоўнае развіццё не толькі ў Францыі, але і на еўрапейскім кантыненце [1, с. 242]. Аднак адзначым, што ў Францыі прыдворная партыя і свецкае грамадства не былі адзінымі гаспадарамі становішча. Паралельна ў царкоўна-палітычнай галіне вылучалася магутная духоўная эліта, якая ўзвышалася над сваім асяроддзем і адрознівалася ад яго глыбокай, сапраўднай рэлігійнасцю. Імі з’яўляліся такія вялікія багасловы-містыкі, як Францыск Сальскі [13], Вінцэнт дэ Поль, Фенелон [14], Бурдалу [15], Блез Паскаль [16–18]. Французскія містыкі былі не толькі выдатнымі асобамі сваёй эпохі, але і ў царкоўна-гістарычным сэнсе ўвасаблялі сабой яе галоўны змест і апасродкаваны ўплыў на еўрапейскае багаслоўе.

Святасць, пабожнасць, багаслоўскія працы гэтых прадстаўнікоў Царквы сталі ўплывовым фактарам для царкоўнага жыцця таго часу і для будучыні французаў. Супрацьстаянне свецкай і духоўнай эліт вызначыла еўрапейскае развіццё на цэлае стагоддзе. Гісторыкі Царквы лічаць, што Францыя ў XVII ст. з’яўлялася галоўнай арэнай гісторыі каталіцкага Касцёла, паколькі барацьба хрысціянскіх артадоксаў з галіканізмам складала яе асноўны змест.

Пэўны адбітак на развіццё багаслоўя ў XVII ст. пакінула нямецкая Царква. Германія, абяскроўленая Трыццацігадовай вайной (1618–1648 гг.), толькі з сярэдзіны стагоддзя хоць і са спазненнем, але адраджаецца для новага жыцця. На думку гісторыкаў хрысціянства, у галіне багаслоўя Германія адставала ад Францыі. Але знакавыя дасягненні ўсё ж мелі месца. Як і ў перыяд Сярэдневякоўя галоўную ролю ў даследаванні кніг Святых Пісання і Падання, каментарыяў да іх адыгрывалі прадстаўнікі ўніверсітэцкіх багаслоўскіх кафедр.

Першым у шэрагу французскіх багасловаў-містыкаў знаходзіцца Францыск Сальскі (нарадзіўся ў 1567 г.). Яго бацькі належалі да старадаўняга арыстакратычнага сямейства герцагства Савойскага. Ва ўзросце трынаццаці гадоў у Парыжы ён атрымліваў адукацыю спачатку ў каледжы езуітаў, затым у Парыжскім універсітэце. У 1579 г. Ф. Сальскі паступае ў Падуанскі ўніверсітэт для працягу навучання па праве і тэалогіі. Пасля пасвячэння, нягледзячы на маладосць, Францыск атрымаў ганаровую пасаду дэкана жэнеўскага капітула, рэзідэнцыя якога знаходзілася ў Ансі, дзе шырока быў распаўсюджаны кальвінізм. Там ён праславіўся паспяховай прапаведніцкай дзейнасцю [13, с. 5].

Францыск звярнуў увагу на вострую патрэбу вернікаў у духоўных настаўленнях. Кіраўніцтва і каментарыі былі размешчаны ў розных пісаннях Святых Айцоў, лістах свяціцеляў, казаннях, аднак кнігі, у якіх яны былі б сабраны і сістэматызаваны, адсутнічалі. Францыск вырашыў гэту задачу – сабраў і сістэмазаваў духоўныя парады ў даследаванні «Руководство к благочестивой жизни». Праца складалася з пяці частак.

Агульная накіраванасць настаўленняў Святога Францыска Сальскага заключалася ў тым, каб засяродзіць увагу верніка, які імкнецца да пабожнасці, да ўнутранага ўдасканалення, прывядзення сябе ў раўнавагу шляхам пастаяннай працы над ачышчэннем сэрца. «Руководство» напісана яснай вобразнай мовай, зразумелай шырокаму колу чытачоў. Парады і навучанні чаргуюцца то са зваротамі да Бога, то са словамі псалмоў і малітваў, што надавала ўсёй кнізе выгляд жвавай, простай гутаркі.

У кантэксце «Руководства» тэма посту ў даследаванні асвечана фрагментарна. Каментарыі да посту аўтар развівае ў трэцяй частцы кнігі – «Думкі пра практыкаванні ў цнотах». На думку багаслова, постніцтва мае важ-

Рэпазіторый БДПУ

нае значэнне: душыць плоць, узвышае дух, падпарадкоўвае апетыт і цела розуму і волі чалавека. Так, аўтар адзначаў: «Старайся асабліва выконваць сераду і пятніцу. Але пост не павінен быць празмерным. Мы паддаёмся спакусе і тады, калі атрымліваем занадта шмат, і тады, калі атрымліваем занадта мала ежы. Празмерная суровасць посту можа зрабіць чалавека няздольным да спраў любові. Трэба сувымяраць пост з сілай і цяжкасцю, якія нясе чалавек.

І пост, і праца запрыгоньваюць цела. Калі трэба выбіраць, то карыснай працы на славу Божую трэба аддаць перавагу» [13, с. 68].

Каменціруючы пост, Францыск рэкамендаваў кіравацца новазапаветнай традыцыяй: «Трэба берагчы цялесныя сілы для карысных прац, таму што аслабіць іх можна заўсёды, калі гэта трэба, але аднавіць не так лёгка. Ешце ўсё, што вам прапанавана (Лк. 10.8), не разбірайце ежы і не надавайце гэтаму залішняй увагі». Францыск меркаваў, што лепш быць заўсёды разумна ўмераным, чым часам залішне строгім, а іншы раз распушчаным [13, с. 68].

Вінцэнт дэ Поль цалкам прыняў багаслоўе і служэнне Францыска Сальскага. Аднак у кагорце вялікіх пастыраў-містыкаў ён стаў геніем практычнага сэнсу, цудоўным арганізатарам. Яго працамі быў пакладзены пачатак арганізацыі свецкай дабрачыннай дзейнасці і багаўгодных устаноў, далучэння і культывавання новазапаветных традыцый да практыкі [1, с. 253].

У настаўленні, адносна запаведзяў, Сакрамантаў і малітвы, яшчэ адзін з містыкаў Фенелон звяртаўся да новазапаветных традыцый: «...Павага не вуснамі, а сэрцам; абрады служаць толькі для выказвання і ўзбуджэння ў нас рэлігійнага пачуцця, а не ўвасабляюць саму сутнасць рэлігіі, што вера ўнутры нас, бо Бог шукае пакланення ў Духу і праўдзе» [14, с. 56].

Езуіт-багаслоў Луі Бурдалу – «Кароль прапаведнікаў і прапаведнік каралёў», які атрымаў ганаровую місію прапаведваць у Калядны і ў Вялікі пост перад Людовікам XIV і яго дваром, таксама фрагментарна асвятляў постніцтва ў сваіх працах. Так, у працы «Слове в неделю перед Рождеством Христовым, о строгости покаяния» багаслоў каменціраваў Сакрамант-Таінства пакаяння, тлумачыў яго мэту – асудзіць і пакараць грэх самастойна. Аднак пакаянне павінна быць сапраўдным [15, с. 199]. Сапраўднасць яго, на думку Луі, прадпісвала вынішчыць з сэрца схільнасці, якія мы асуджаем як злачынныя, прызнаём як цягу да граху; пакарыцца душой усяму таму, што прапаведуе супраць свавольства д'ябла. Старазаветныя традыцыі, прынятыя ў якасці абавязковых правіл Царквы – забіць сваю плоць постам і дбаннем; апрануцца ў валасяніцы і вярэту; пасыпаць галаву попелам, пакланіцца ў ногі святару, – на думку багаслова, абавязковыя, але яны маюць усе ж знешняе адценне. Больш важным для хрысціяніна Луі знаходзіў ва ўнутраным імпульсе – сувымяраць жыццё паводле Ісуса Хрыста. Пакаянне павінна «заглушыць голас помсты ў сэрцы, дараваць крыўду, вярнуць злачынна набыты маёнтак, аднавіць добрую славу блізкага, азмрочаную паклёпамі [15, с. 219].

Дэталёвае разуменне традыцыі і практыкі постніцтва пакінуў вялікі філосаф і багаслоў Блез Паскаль. У 1654 г. ён перажыў містычнае бачанне, дакладны змест якога застаўся невядомым. Свае ўражанні ад яго Блез выклаў у запісе, пад загалоўкам «Мемарыял». Запіска была зашытая ў падшыўку камзола і знойдзена пасля яго смерці. З дакумента вынікае, што ён здабыў Бога і зразумеў усю нікчэмнасць свецкага жыцця. Менавіта з 1654 г. ён пачаў пісаць кнігу, у якой простымі і ўсім зразумелымі доказамі было б паказана існаванне Бога і слушнасць паслядоўнікаў Ісуса Хрыста. У знакамітых «Письмах к провинциалу» і «Мемарыяле» свецкі чалавек Паскаль, абмяркоўваючы пытанні веравучэння, не наносіў ніякай шкоды аўтарытэту Царквы і рэлігіі, перш за ўсё, ратаваў іх аўтарытэт [16, с. 507].

Блез рабіў гэта тымі ж метадамі, якімі ён карыстаўся ў навуковых дыскусіях. Змест Мемарыялу зводзіўся да чатырох пунктаў: 1. Містычнае прыняцце Хрыста ў якасці асабістага Бога і ганьбаванне навуковых разважанняў аб Боскай прыродзе. 2. Раскаянне ў сваім ладзе жыцця, выкрыццё ўласнага «адступніцтва ад Хрыста». 3. Прызнанне евангельскіх максім адзіным сродкам здабыцця Хрыстовай ласкі, выказванне поўнай пакоры Богу і свайму духоўніку. 4. Рашучасць цалкам адмовіцца ад свету і навечна не разлучацца з Богам [17, с. 414].

Філасофская ісціна, па цвёрдым перакананні Паскаля, раскрываецца з дапамогай рэлігіі, а засваенне яе толькі часткова апасродкуецца доказам. Крытыкуючы хлуслівую мараль казуістаў і нядобрасумленнасць іх доказаў, адкідаючы хітраспляценні схаластычных тэрмінаў, Паскаль вызваляў месца для жывога рэлігійнага пачуцця, узровень якога ён знаходзіў перавышаючым узровень, які даступны доказу [16, с. 508]. Гэта мы бачым у звароце

Рэпазіторый БДПУ

аўтара да Бога з просьбай аб удзеле ў станаўленні веры: «Дай жа мне, Госпадзі, у маўчанні пакланіцца перад парадкам Твайго дзівоснага ўдзелу ў маім жыцці… Госпадзі, усведамляю чаму сэрца маё так зчарсцвела і запоўнена мірскімі думкамі, клопатамі, турботамі і прыхільнасцямі, што і хвароба, і здароўе, і гутаркі, і кнігі, і міласціна, і пост, і ўмярцвенне цела, і цуды, і Сакраманты – усе намаганні мае і свету бяссільны звярнуць мяне без дапамогі Тваёй ласкі» [17, с. 12]. Паскаль указваў на постніцтва і далучыў яго да найважнейшых складовых веравызнання [18, с. 392].

Толькі фрагментамі закранута тэма постніцтва ў працах французскага філосафа-метафізіка, картэзіянца Нікаля Мальбранша (1638–1715). Нікаля быў выразнікам ідэі, што ўсё, што існуе ў матэрыяльным свеце, – ідэі Бога, а чалавек спазнае рэчы пастолькі, паколькі спазнае Бога, гэта значыць бачаннем іх праз Бога. Мальбранш сфармуляваў вучэнне аб прычыннасці – аказіяналізм, а таксама абгрунтаваў тэзіс аб немагчымасці ўплыву цела не толькі на душу, але і іншыя целы. У знакамітым даследаванні «Разыскание истины», якое стала плёнам дзесяцігадовай уседлівай працы, багаслоў дэталёва апавядаў пра прыроду чалавечага розуму і пра тое, што ён павінен зрабіць, каб пазбегнуць памылак у навуцы. Метафізіка і рэлігія для Мальбранша мелі паасобнае быццё, але яны аб'яднаны агульным прынцыпам. Нікаля быў філосафам у поўным сэнсе гэтага слова, але ў той жа час ён хрысціянін, прасякнуты дзейснаю верай, якая ні на хвіліну не перастае натхняць яго.

Ён лічыў, што толькі ўмацоўваючы сваю сувязь з Богам, чалавек набліжаецца да крыніцы ўсякага ведання, а гэта мэта філасофіі. У супрацьлегласць багаслоўю, якое бярэ гатовыя догмы і з іх вынікі, філасофія мае справу з ідэямі рэчаў, і гэтыя ідэі падлягаюць не веры, а розуму, які можа супакоіцца толькі пры пазнанні дакладнага і відавочнага [19, с. 12].

Палемізуючы з апанентамі, Мальбранш паказваў на адну з галоўных памылак вернікаў – фармалізм дэманстрацыі веры, калі «...значна менш і любові, і цноты ў тых, хто прывязаны да некаторых забабонаў і чый галоўны занятак якія-небудзь фарысейскія і іўдэйскія абрады. Бог хоча, каб Яму пакланяліся ў духу і праўдзе. Яго не задавальняе крывадушнасць і знешняе пакланенне, калі перад Ім становяцца на калені і ўслаўляюць яго вуснамі, а сэрца не ўдзельнічае ў гэтым [19, с. 377].

У гэтым фанатызме і фарысействе, няхай гэта будзе зман або крывадушнасць, Мальбранш знаходзіў сур'ёзную пагрозу хрысціянству ў цэлым, даказваў, што, не жадаючы пакінуць свайго ідалапаклонства, фанатыкі імкнуцца знешне выканаць якія-небудзь добрыя справы: яны посцяць, як і іншыя, даюць міласціну, чытаюць малітвы... хапаюцца за вядомыя дробныя абрады або лёгкія справы набожнасці, якія, узгодненыя з сябелюбствам, непазбежна, але незаўважным чынам абвяргаюць усю мараль Ісуса Хрыста [19, с. 378]. Гэта, па глыбокім перакананні Нікаля, скажала сутнасць веры ў Ісуса Хрыста і ў выніку яе знішчала.

Гісторыкі Царквы лічылі, што Францыя ў XVII ст. з'яўлялася галоўнай арэнай гісторыі Каталіцкай Царквы, а барацьба багасловаў-містыкаў з галіканствам склала яе асноўны сэнс. Царкоўная гістарыяграфія прыняла гэтых багасловаў, іх разважанні як лепшае, што можа вылучыць французская культура і літаратура XVII ст., якое гісторыкі Царквы назвалі стагоддзем святых.

Значны ўплыў на тэалогію і духоўнае жыццё Германіі разглядаемага перыяду зрабіла творчасць рэфармацыйнага багаслова Іагана Арнта. Яго знакамітая праца «Об истинном христианстве», выдадзеная ў 1609 г., складаецца з чатырох кніг [20, с. 6].

Пратэстанцкія цэрквы Германіі прайшлі складаны шлях станаўлення. Лідар і ініцыятар нямецкай рэфармацыі Лютэр не рабіў спроб выкладаць свае думкі ў выглядзе якой-небудзь сістэмы. Даследчыкі гісторыі хрысціянства сцвярджалі, што лютэранскае багаслоўе стала фарміравацца «з блытаніны багаслоўскіх меркаванняў і прыватнасцей» толькі пасля смерці Лютэра: «Гэты працэс, які быў больш-менш завершаны з узнікненнем формулы згоды 1580 г.». На крышталізацыю апошняй, акрамя ўласна багаслоўскіх плыняў, звязаных з імёнамі Лютэра, Меланхтона і Кальвіна, паўплывала і знешняе гуманістычнае асяроддзе эпохі [21, с. 9–10].

Пасля смерці Лютэра ў 1546 г. паміж яго паслядоўнікамі ўзніклі спрэчкі і падзелы. У 1569 г. саксонскім курфюрстам Аўгустам была ініцыявана праца над складаннем так званай «Формулы згоды», да якой былі прыцягнуты вядучыя лютэранскія тэолагі. Напісанне гэтага верапавучальнага дакумента было завершана да 1577 г., а яго прыняцце паклала канец дзесяцігоддзям дагматычных спрэчак унутры лютэранства. Аднак не ўсе лютэранскія землі прынялі «Формулу згоды»;

Рэпазіторый БДПУ

у іх ліку было і Анхальтскае княства, дзе на рубяжы стагоддзяў служыў Арнт. Сутыкнуўшыся з маральным станам сваёй паствы, Арнт пераканаўся ў яе нізкім узроўні, што ў гісторыка-багаслоўскай навуцы называецца «крызісам набожнасці» ў лютэранстве на мяжы XVI–XVII ст.

Багаслоўе Лютэра аб тым, што хрысціянін уратуецца толькі верай у адкупіўшага ўсе нашы грахі Ісуса Хрыста і ніякіх спраў не патрабуецца, неўзабаве прывяло да таго, што прававерʼе і пабожнасць, якія, па перакананні Лютэра, непарыўныя, на практыцы аддзяліліся адзін ад аднаго. Трапіўшы на масавую глебу, тонкія і складаныя інтэнцыі Лютэра аб уратавальнай веры звяліся да фармальнага захавання прававерʼя: галоўнае – трымацца «чыстага вучэння» і можна жыць, як хочаш. Маральнае жыццё хрысціян прыходзіла да заняпаду, што бачыў, заклеймаваў ганьбай і прапанаваў выправіць у сваёй працы Арнт.

Праца атрымала станоўчыя водгукі тэалагічных універсітэтаў Еўропы. Толькі пры жыцці Арнта выйшла 11 выданняў кніг. Даследаванне стала адным з самых папулярных і любімых у Еўропе, што перакладзена на ўсе еўрапейскія мовы.

Каменціруючы пост і аскезу, Арнт прытрымліваўся класічных настаўленняў вялікіх хрысціянскіх багасловаў: Ірынея Ліёнскага, Тэртуліяна, Васіля Вялікага, Іаана Златавуста, Амброзія Медыяланскага, блаж. Аўгустына, Рыгора Вялікага, Бернара Клервоскага і інш. Арнт дэталёва даследаваў і абагульніў духоўны і культурны вопыт папярэдніх эпох. Ігумен Пётр Мешчарынаў адзначае: «Адсюль вынікаюць шырыня і ўсёахопнасць, якія робяць кнігу прымальнай для ўсіх хрысціянаў» [21, с. 23].

Постніцтву ў даследаванні прысвечана дзявятая глава другой кнігі «Пра тое, што значыць тварыць пакаянне, як яно павінна здзяйсняцца і як Ласка Божая вядзе нас да пакаяння». Аўтар у дэталях даследаваў практыкі пакаяння ў кнігах Старога і Новага Запаветаў, пракаменціраваў вучэнні і прадпісанні Апосталаў, прарокаў. Ён указаў на абавязковае патрабаванне ў кнігах Бібліі суправаджэння пакаяння постніцтвам і аскезай. Ён адзначаў, што на пытанне, як звярнуцца да Бога і быць пачутым, прарок Ёіль адказваў – усім сэрцам Сваім у посце, плачы і рыданні (Ёіль 02:12) [20, с. 372].

Далей багаслоў мяркуе, спасылаючыся на прарока, што да Бога трэба звяртацца ў посце, пры гэтым Арнт паказваў на ўсеагульны пост цэлага народа. Прарок прадпісвае яго для таго, каб усё грамадства стала пакорным перад Богам, адкрыта спавядала свае грахі, раскаялася ў іх і аплаквала іх. Усё гэта павінна здзяйсняцца ў пост, каб людзі звярталіся да Бога і малілі Яго аб прабачэнні грахоў і аб адхіленні ўсеагульнага пакарання з чыстымі думкамі і душою. Такі ўсеагульны пост, пакаянне, шчырае раскаянне і прабачэнне грахоў, вера, малітва, споведзь, маленні і просьбы аб дараванні вельмі моцныя і дзейсныя для таго, каб Бог не ўжыў Свой гнеў і адвёў ад людзей пакаранне...

Армт прыводзіць прыклады з Бібліі. Так, у Першай кнізе «Паралипоменон» чытаем, што калі сыны Ізраілевыя былі пабіты Філістымлянамі і Саўл з Ёнатанам загінулі, дык мужы Галаадскія пасціліся сем дзён (1 Пар. 10:12). [20, с. 373].

Такі пакаянны пост практыкаваўся і ў старажытнай Царкве, калі ўся хрысціянская абшчына падчас вялікіх усеагульных няшчасцяў прыносіла пакаянне – не для таго, каб самім па сабе постам заслужыць прабачэнне грахоў, але каб упрасіць Бога абярнуць усеагульнае пакаранне пакаяннем, цвярозасцю і пакорай у сэрцы. У калектыўным пакаянні і посце багаслоў бачыў выхаваўчы працэс абшчыны, хрысціянскай цывілізацыі з мэтай яе абароны і выратавання.

Арнт быў упэўнены, што «варта было б і сёння захаваць гэты звычай. А такі пакаянны пост быў бы цвёрдым умацаваннем і абаронай нашай супраць магаметан і ўсіх непрыяцеляў, вялікім блаславеннем у голад, усеагульным лячэннем ад хвароб, абаронай усякага нашага набытку. У Святога Іова, мы чытаем, што ён ахвярапрынашэннем, малітвай і постам маліў Бога аб дзецях сваіх, калі яны балявалі (гл .: Ёў 1: 5), і як ён абараняў і ахоўваў дом свой малітвай, так што сам дʼябал не мог напасці на яго [20, с. 374].

Арнт падкрэсліваў, што да такога посту народ павінен падыходзіць з самай вялікай сурʼёзнасцю, без усялякай крывадушнасці: «Бог спадзяецца на кожнага, хто спавядаў грахі свае, Ён чакае ад нас сапраўднага пакаяння і пакоры» [20, с. 375]. Характарызуючы сапраўднае пакаянне, багаслоў перасцерагаў: раздзірайце сэрцы свае, а не вопратку сваю (Ёіль 02:13). Іўдзеі рабілі гэта, пасцілі нярэдка проста для выгляду.

У канцы главы прыводзіцца аўтарскае вызначэнне і каментарый хрысціянскага сапраўднага посту, які суправаджае Сакрамант пакаяння. Ён заключаецца у тым, каб не мець грахоў, звяргаць злыя пажадлівасці плоці, забіць

Рэпазіторый БДПУ

ў сабе састарэлага Адама, прабываць у любові, цярплівасці, міласэрнасці і ўсё гэта здзяйсняць з пакорай у сэрцы [20, с. 375]. Калі вучэнне Лютэра апраўдвала хрысціяніна выключна верай, то Арнт прыраўноўваў да веры хрысціянскія ўчынкі і пост.

Першым філосафам, які абгрунтаваў прынцыпы ідэалістычнай філасофіі, быў Якаў Бёме. Рамантыкі ахрысцілі яго «нямецкім (тэўтонскім) філосафам» (philosophus Teutonicus). Бёме падзяляў сваю філасофію (якую называюць тэасофіяй, богамудрасцю, богапазнаннем) на ўласна філасофію, якая вывучае сілы Бажаства; астралогію, што пранікае ў сілы прыроды; і багаслоўе, якое спасцігае Царства Ісуса Хрыста. Завершанай сістэмы ў Бёме няма; больш за тое, у некаторых выпадках ён супярэчыць самому сабе [22, с. 21].

Багаслоўе Бёме выкладзена ў працах: «Аврора, или утренняя заря в восхождении» (аўтар лічыў гэта даследаванне знакам і сродкам пазнання Вялікай Таямніцы – Бога), «О трех принципах», «О рождении и обозначении всех сущностей». «Христософия. Путь ко Христу» завяршае яго багаслоўскую сістэму. «Христософия» ўзгадняецца ў Бёме са святаайчыннай традыцыяй. Галоўныя ідэі хрысціянскай маральнасці для Бёме – сутнасць адмова ад сябе – пакора і пакаянне. Прынцыпова неабходная хрысціяніну і Царква: спачатку ва ўласнай душы, затым у сабornасці ўсіх прыняўшых Хрыста і толькі потым ужо ў храме як абавязковым выніку і ўмове замацавання веры. Царква для Бёме, такім чынам, не проста каменны будынак, а духоўны сабор вернікаў, чым, уласна, яна і з'яўляецца [22, с. 21].

Каменціруючы пост і аскезу, Бёме адзначаў, што менавіта яны выступаюць сродкамі выхавання волі: «Калі ж яна (воля розуму – саўдзельніца Боскага Царства) супраціўляцца стане, то ты абвясці вайну пажадлівай зямной плоці, не давай ёй нічога таго, чаго яна жадае, прымусь яе посціць і галадаць. ...Лічы волю плоці за ворага твайго, і не рабі нічога таго, чаго юрлівасць плоці хоча. Такім чынам, ты нанясеш смерць смерці плоці [23, с. 92].

Больш за тое, багаслоў паказвае не толькі значнасць посту ў якасці сродку, але і падкрэслівае сілу посту і малітвы, спасылаючыся на прарока Данііла, якому анёл сказаў: «Калі ты пасціўся ў пачатку малення твайго аб грахах тваіх і народа, прынёс я мальбу тваю перад Богам, зышоў гэты загад: і я прыйшоў, каб паказаць табе гэта, бо ты Богу даспадобы і дарагі» (Данііл, IX, 23). Прачытай гісторыю пра Товію, каб зразумець, што можа малітва, пост і падрыхтоўка сябе да Валадарства Божага; усё Святое Пісанне напоўнена гэтым [24, с. 348].

Аднак сапраўдны пост, паводле меркавання Бёме, павінен быць напоўнены зместам Новага Запавету. Багаслоў удакладняў: «Хрыстос сказаў вучням сваім, калі выгнаў дэманаў з шалёнага падчас маладзіка, бо вучні не маглі здзейсніць гэтага сваім уласным розумам: «Гэты род не можа выйсці інакш, як ад малітвы і посту» (Мк, IX, 29). Умілаваныя браты, вы не выганіце з нас д'ябла, калі ў вас саміх няма Ісуса Хрыста: вашы штучныя "высновы" толькі адводзяць ад Бога ва ўласную волю». «Мы павінны посціць і маліцца, каб не ўпасці ў спакусу, і ў розуме нашым не папасці ў сеткі д'ябальскія» (Мф, XXVI, 41) [24, с. 354].

Містыка Бёме мае глыбокія карані, якія ўзыходзяць да багаслоўя позняга Сярэднявечча Германіі, да Майстара Экхарта (каля 1260 – каля 1327/1328). Да школы Экхарта таксама належалі Ёханэс Таўлер (1300–1361), Генрых Сузо (1295–1366) – абодва дамініканцы, сам Экхарт прымае яго багаслоўе і М. Лютэр [22, с. 17].

Багаслоўе Майстара Экхарта паўплывала на Бёме і на Анёла Сілезскага. Анёл Сілезскі (Ёханэс Шефлер, 1624–1677) – лекар па адукацыі, лютэранін па веравызнанні бацькоў – у 1654 г. пад уплывам нямецкіх містыкаў перайшоў у каталіцтва, а ў 1661 г. стаў членам манаскага ордэна францысканцаў. Галоўнае палажэнне яго пропаведзяў – чалавек павінен вярнуцца ў Божы вобраз праз бясстраснасць, адмовіцца ад волі, ад самога сябе праз Праабражэнне [22, с. 17].

Каталіцкая містыка Анёла Сілезскага ўяўляе сабой адыход ад лютэранска-евангелічнай артадоксіі, звязанай з непасрэдным зваротам да Бога, да інтуітыўнага спазнання свету. Лейтматывам гэтага пошуку служыць формула «Бог – ува мне і я – у Богу», што, безумоўна, навеяна евангелічнай містыкай Іаана Багаслова [22, с. 39].

Чаму Анёл Сілезскі перайшоў у каталіцтва? Даследчыкі яго багаслоўя звязваюць яго ўчынак з асаблівасцямі каталіцкага містычнага вопыту. У пратэстанцкай Германіі гэты вопыт паступова адыходзіў ад Царквы, перажываўся асабіста і нават індывідуальна: пазнанне Бога – справа інтуіцыі, даецца адкрыццём у абстрагаванні ад зямнога і «неспасціжна розумам». Лютэранства з яго рацыяналізмам мала дапамагала пачуццю містычнага, у той час як каталіцкую Святую Імшу-Літургію адрознівала цудоўнае і таемнае, адпаведнае

Рэпазіторый БДПУ

хрысціянскай сімволіцы. Падчас Контррэфармацыі ўспомнілі менавіта яе містычны характар [22, с. 17].

Галоўнае сачыненне Анёла Сілезскага, апублікаванае ў 1657 г., «Остроумные речения и вирши». Пры другім выданні ў 1675 г. яно атрымала назву «Херувимский странник», стала знакамітым, прызнана вяршыняй містыкі, аказала значны ўплыў на наступнае развіццё нямецкай тэалогіі і філасофіі [22, с. 7].

Асноўнай містычнай ідэяй «Херувимского странника» з'яўляецца агульная ідэя аб зліцці Бога і чалавека, пра іх «інтымную» блізкасць (unio mystica). Зліццё Творцы і стварэння, калі яго вывесці за межы абагаўлення і разглядаць як узаемапераўтварэнне, акажацца думкай цалкам ерэтычнай, звязанай у той жа час з гуманізацыяй багаслоўскай навукі [22, с. 33].

Калі абагульніць ідэі «Херувимского странника», то іх можна прадставіць у наступным выглядзе. «Бог ува мне, я – у Богу» мае варыяцыі: як Бог нараджае мяне ў сабе, так і я ў сабе нараджаю Бога; Я раблюся Хрыстом у Духу, як Ён стаў мною ў плоці; Бог і чалавек праз Сына (г. зн. у Хрысце) могуць мяняцца месцамі; калі я нараджаю ў сабе Хрыста, то я – духоўная Дзева Марыя; усе «людзі» – нявесты Хрыстовыя? і «аз есмь невеста Христова».

Анёл Сілезскі значную ўвагу надаў постніцтву і аскезе, дэталёва асвяціў іх значэнне для хрысціяніна ў двух апошніх кнігах «Вестника». Афарыстычныя вершы шостай кнігі прысвечаны ў асноўным пытанням граху, пакаяння, посту, дабрачыннасцям мудрага, заганам глупства і скнарнасці, адхіленасці ад свету, які ўвязнуў у зле, чысціні сардэчнай, каталіцкай тэме «воіна Хрыстова», зліцці з Богам. У гэтай кнізе ў большай ступені, чым у іншых, вылучаецца адна з асаблівасцей «Херувимского странника»: «збіранне» афарызмаў па тэматычных групах [22, с. 45].

Так, паказваючы шлях да святасці, багаслоў арыентаваў і накіроўваў: «Найкарацейшы шлях да святога жыцця згодай выкладзены, постам і лагоднасцю» [22, с. 223], а калі хочаш Богу дагадзіць: «Тры рэчы датрымлівай у духоўным узыходжанні...: малітву, пост і дбанне [22, с. 177]. Сілезскі лічыў, што многія вернікі схільнасцю да сузірання прыкрываюць сваю лянноту, таму практычныя справы – пост, аскеза, пакаянне неабходны для кожнага хрысціяніна, менавіта яны дапамогуць: «А калі пост трымаць, жыць ва ўстрыманні строгім, – Душа і дух і плоць зноў зрадняцца з Богам [22, с. 421].

І нават у супрацьстаянні і барацьбе з д'яблам, які «чуе толькі трэск, разумны толькі ў шуме, гомане: ...абдуры яго малітвай і постам [22, с. 183], на думку Сілезіуса, можна перамагчы. Больш за тое аўтар лічыў, што «Д'ябла адолець лёгка – дарэмна не бойся: пост, малітвы, дбанні дапамогуць адолець і д'ябла ў бітвах» [22, с. 464]. Адказваючы на пытанне аб завяршэнні жыццёвага цыкла, падвядзенні вынікаў і надзеі на выратаванне і вечнае знаходжанне з Творцам, аўтар сцвярджаў і ўказваў зноў на пост і аскезу як умову выканання гэтага жадання. Для рэалізацыі пастаўленых мэт і рашэння задач багаслоў рэкамендаваў: «Пасціся, каб схуднець, таму што нябесны ўваход: у кім спрыту няма, у яго і не ўвойдзе» [22, с. 432].

«Херувимский странник» прызнаны вяршыняй містыкі, што аказаў значны ўплыў на наступнае развіццё нямецкай тэалогіі і філасофіі. Менавіта з творчасці Бёме і Анёла Сілезскага ў нямецкай літаратуры пачалося зліццё паэзіі з багаслоўем і філасофіяй, якое было асэнсавана і абвешчана рамантыкамі і ўсёй наступнай рамантычнай філасофіяй у Германіі – ад Ф. Шлегеля да Ф. Ніцшэ і М. Хайдэгера. Гэта дазваляе гаварыць не толькі аб паэтычным багаслоўі (філасофіі), але і пра багаслоўе (філасофію) як паэзію [22, с. 34].

Падводзячы вынік Рэфармацыі і Контррэфармацыі ў сферы палітычнага, духоўнага і інтэлектуальнага жыцця на еўрапейскім кантыненце ў XVI–XVII стст., Б. Расэл адзначыў, што наступствы «спачатку ў цэлым былі неспрыяльныя, але ў канчатковым выніку апынуліся добратворныя. Трыццацігадовая вайна пераканала кожнага, што ні пратэстантаў, ні каталікоў цалкам перамагчы нельга, таму з'явілася неабходнасць адкінуць сярэдневечную надзею стварыць адзінства веры, а гэта павялічыла свабоду людзей самастойна думаць нават пра самыя фундаментальныя пытанні» [5, с. 485]. Менавіта на вырашэнне фундаментальных пытанняў багаслоўя ў XVII ст. былі сканцэнтраваны інтэлектуальныя намаганні Каталіцкай Царквы. Цэнтральнай арэнай проціборства была Францыя.

Скаваная ланцугамі абсалютызму, якія прасціраліся над хрысціянскім светам, Царква магла адказваць толькі на сваёй уласнай мове, звяртаючыся да багаслоўя выратавання супраць канцэпцыі галіканізму. У той час, калі хрысціянства вагалася паміж гераічнай і арыстакратычнай мараллю, французскія містыкі, натхнёныя Евангеллем, прапанавалі свае ўзоры, што ў наступным увайшло ў гісторыю як эпоха Святых. Выступаючы супраць абсалютызму мыслення, Царква садзейнічае ўзнік-

Рэпазіторый БДПУ

ненню містычных плыняў, закрытых, спакойных, ураўнаважаных духоўных школ, пачынаючы ад Святога Францішка Сальскага, Французскай школы, школы езуітаў, дзе рыхтавалася хрысціянская эліта з дапамогай «Духоўных практыкаванняў» Святога Ігната Лаёлы.

Пэўны адбітак на развіццё багаслоўя ў XVII ст. пакінула нямецкая Царква. Германія, абяскроўленая Трыццацігадовай вайной, толькі з сярэдзіны стагоддзя адраджаецца да новага жыцця. У сферы высокай літаратуры і багаслоўя Германія адставала ад Францыі, але знакавыя дасягненні мелі месца. Жыццё і творчасць філосафаў, багасловаў Іагана Арндта, Якава Бёме, Анёла Сілезскага на фоне поўнага заняпаду рэлігійнасці і маральнасці, эпідэмій чумы служылі прыкладам высакароднай душаапякунскай дзейнасці. У сваіх творах яны ўвесь час звярталіся да Святога Пісання, у кантэксце якіх мы знаходім каментарыі пра пост і аскезу, што адлюстраваны ў кнігах Святога Пісання і Святога Падання. Вырашаючы фундаментальныя пытанні светабудовы, багасловы XVII ст. фрагментарна закраналі тэмы пастніцтва і аскезы, робячы акцэнт на новазапаветнай традыцыі апошніх.

*Літаратура*


1. *Лортц, Йозеф.* История Церкви (рассмотренная в связи с историей идей) : в 2 т. / Й. Лортц. – М. : Христианская Россия, 1999–2000. – Т. 2 : Новое Время. – 2000. – 579 с.
2. *Вульф Морис,* де Средневековая философия и цивилизация / Морис де Вульф ; пер. с англ. О. Д. Сидоровой. – М. : ЗАО Центрполиграф, 2014. – 253 с.
3. *Коплстон, Ф.* История философии. Средние века / Ф. Коплстон ; пер. с англ. Ю. А. Алакина – М. : ЗАО Центрполиграф, 2003. – 494 с.
4. *Реале, Дж.* Западная философия от истоков до наших дней : в 2 т. / Дж. Реале, Д. Антисери ; пер. с итал. С. Мальцевой. – М. : ТОО ТК «Петрополис», 1995. – Т. 2. Средневековье. – 368 с.
5. *Рассел, Бертран.* История западной философии и ее связи с политическими и социальными условиями от античности до наших дней : в 3-х кн. / Б. Рассел. – 3-е изд., стер. – М. : Академический Проект, 2000. – 768 с.
6. *Бедуелл, Ги.* История церкви / Ги Бедуелл. – М. : Христианская Россия, 1996. – 304 с.
7. *Гергей, Енё.* История папства / Е. Гергей ; пер. с венгр. – М. : Республика, 1996. – 456 с.
8. *Ранке, Л фон.* Римские папы, их церковь и государство в XVI и XVII столетиях / Леопольд фон Ранке ; пер. с нем. – М. : Либроком, 2016. – Т. 2. – 544 с.
9. Введение в историю Церкви. Ч. 2: Обзор историографии по общей истории Церкви : учеб. пособие / под ред. В. В. Симонова. – СПб., 2015. – 728 с.
10. *Смирнов, Евграф.* История Христианской Церкви / Евграф Смирнов. – М. : Храм Косьмы и Дамиана, 2007. – 730 с.
11. *Корелин, М.* Важнейшие моменты в истории средневекового папства / М. Корелин. – М. : Либроком, 2012. – 154 с.
12. *Ермишин, О. Т.* Философия религии: Концепция религии в зарубежной и русской философии : учеб. пособие / О. Т. Ермишин. – М. : Изд-во ПСТГУ, 2009. – 224 с.
13. *Сальский, св. Франциск.* Руководство к благочестивой жизни / Св. Франциск Сальский. – Брюссель : Изд-во «Жизнь с Богом», 1994. – 122 с.
14. *Фенелон.* О воспитании девочек / Фенелон. – М. : Тип. Э. Лисснера и Ю. Росана, 1896. – 117 с.


*References*


1. *Lortts, Yozef.* Istoriya Tserkvi (rassmotrennaya v svyazi s istoriyey idey) : v 2 t. / Y. Lortts. – M. : Khristianskaya Rossiya, 1999–2000. – T. 2 : Novoye Vremya. – 2000. – 579 s.
2. *Vulf Moris, de.* Srednevekovaya filosofiya i tsivilizatsiya / Moris de Vulf ; per. s angl. O. D. Sidorovoy. – M. : ZAO Tsentrpoligraf, 2014. – 253 s.
3. *Koplston, F.* Istoriya filosofii. Sredniye veka / F. Koplston ; per. s angl. Yu. A. Alakina – M. : ZAO Tsentrpoligraf, 2003. – 494 s.
4. *Reale, Dzh.* Zapadnaya filosofiya ot istokov do nashikh dney : v 2 t. / Dzh. Reale, D. Antiseri ; per. s ital. S. Maltsevoy. – M. : TOO TK “Petropolis”, 1995. – T. 2. Srednevekovye.– 368 s.
5. *Rassel, Bertran.* Istoriya zapadnoy filosofii i yeye svyazi s politicheskimi i sotsialnymi usloviyami ot antichnosti do nashikh dney : v 3-kh kn. / B. Rassel. – 3-ye izd., ster. – M. : Akademicheskiy Proyekt, 2000. – 768 s.
6. Beduyell, Gi. Istoriya tserkvi / Gi Beduyell. – M. : Khristianskaya Rossiya, 1996. – 304 s.
7. *Gergey, Yeno.* Istoriya papstva / Ye. Gergey ; per. s vengr. – M. : Respublika, 1996. – 456 s.
8. *Ranke, L fon.* Rimskiye papy, ikh tserkov i gosudarstvo v XVI i XVII stoletiyakh / Leopold fon Ranke ; per. s nem.– M. : Librokom, 2016. – T. 2. – 544 s.
9. Vvedeniye v istoriyu Tserkvi. Ch. 2: Obzor istoriografii po obshchey istorii Tserkvi : ucheb. posobiye / pod red. V. V. Simonova. – SPb., 2015. – 728 s.
10. *Smirnov, Yevgraf.* Istoriya Khristianskoy Tserkvi / Yevgraf Smirnov. – M. : Khram Kosmy i Damiana, 2007. – 730 s.
11. *Korelin, M.* Vazhneyshiye momenty v istorii srednevekovogo papstva / M. Korelin. – M. : Librokom, 2012. – 154 s.
12. *Yermishin, O. T.* Filosofiya religii: Kontseptsiya religii v zarubezhnoy i russkoy filosofii : ucheb. posobiye / O. T. Yermishin. – M. : Izd-vo PSTGU, 2009. – 224 s.
13. *Salskiy, sv. Frantsisk.* Rukovodstvo k blagochestivoy zhizni / Sv. Frantsisk Salskiy. – Bryussel : Izd¬vo “Zhizn s Bogom”, 1994. – 122 s.
14. *Fenelon.* O vospitanii devochek / Fenelon. – M. : Tip. E. Lissnera i Yu. Rosana, 1896. – 117 s.


Рэпазіторый БДПУ

15. *Бурдалу.* Избранные слова знаменитого проповедника / Бурдалу ; пер. с фр. Я Уткина. – СПб., 1821. – Ч. III. – 295 с.
16. *Паскаль, Блез.* Письма к провинциалу / Блез Паскаль ; пер. с фр. – К. : Port-Royal, 1997. – 592 с.
17. *Паскаль, Блез* Трактаты. Полемические сочинения. Письма / Блез Паскаль ; пер. с фр. О. И. Хомы и С. Долгова ; общ. ред. А. Б. Мокроусова. – К. : Port-Royal, 1997. – 576 с.
18. *Паскаль, Блез.* Мысли / Блез Паскаль ; пер. с фр. – М. : Изд-во им. Сабашниковых, 1995. – 480 с.
19. *Мильбранш, Н.* Разыскание истины / Н. Мильбранш ; пер. с фр. – СПб. : Наука, 1999. – 651 с.
20. *Священник Хондзинский,* Павел. Два труда об истинном христианстве – святитель Тихон Задонский и Иоганн Арндт / священник Павел Хондзинский // Православная библиотека. Азбука веры. – Режім доступа : //azbyka.ru/otechnik/Tihon_Zadonskij/dva-truda-ob-istinnom-hristianstve-svjatitel-tihon-zadonskij-i-iogann-arndt/. –Дата обращения : 01.04.2018).
21. *Арндт, Иоганн.* Об истинном христианстве / Иоганн Арндт ; пер. с нем. ; под ред. игумена Петра (Мещеринова). – М. : Эксмо, 2016. – 1008 с.
22. *Ангелус, Силезиус.* Херувимский странник (Остроумные речения и вирши) / Ангелус Силезиус. – СПб. : Наука, 1999. – 509 с.
23. *Бёме, Я.* Christosophia, или Путь ко Христу / Я. Бёме. – СПб. : A-cad, 1994. – 224 с.
24. *Бёме, Я.* О тройственной жизни человека. / Я. Бёме ; пер. с нем. – СПб. : Издат. дом «Міръ», 2007. – XCII. – 428 с.

15. *Burdalu.* Izbrannyye slova znamenitogo propovednika / Burdalu ; per. s fr. Ya. Utkina. – SPb., 1821. – Ch. III. – 295 s.
16. *Paskal, Blez.* Pisma k provintsialu / Blez Paskal ; per. s fr. – K. : Port-Royal, 1997. – 592 s.
17. *Paskal, Blez.* Traktaty. Polemicheskiye sochineniya. Pisma / Blez Paskal ; per. s fr. O. I. Khomy i S. Dolgova ; obshch. red. A. B. Mokrousova. – K. : Port-Royal, 1997. – 576 s.
18. *Paskal, Blez.* Mysli / Blez Paskal ; per. s fr. – M. : Izd-vo im. Sabashnikovykh, 1995. – 480 s.
19. Milbransh, N. Razyskaniye istiny / N. Milbransh ; per. s fr. – SPb. : Nauka, 1999. – 651 s.
20. Svyashchennik Khondzinskiy, Pavel. Dva truda ob istinnom khristianstve – svyatitel Tikhon Zadonskiy i Iogann Arndt / svyashchennik Pavel Khondzinskiy // Pravoslavnaya biblioteka. Azbuka very. – Rezhim dostupa : //azbyka.ru/otechnik/Tihon_Zadonskij/dva-truda-ob-istinnom-hristianstve-svjatitel-tihon-zadonskij-i-iogann-arndt/. – Data obrashcheniya : 01.04.2018).
21. *Arndt, Iogann.* Ob istinnom khristianstve / Iogann Arndt ; per. s nem. ; pod red. igumena Petra (Meshcherinova). – M. : Eksmo, 2016. – 1008 s.
22. *Angelus, Silezius.* Kheruvimskiy strannik (Ostroumnyye recheniya i virshi) / Angelus Silezius. – SPb. : Nauka, 1999. – 509 s.
23. *Bome, Ya.* Christosophia, ili Put ko Khristu / Ya. Bome. – SPb. : A-cad, 1994. – 224 s.
24. *Bome, Ya.* O troystvennoy zhizni cheloveka. / Ya. Bome ; per. s nem. – SPb. : Izdat. dom “Mir”, 2007. – XCII. – 428 s.

Рэпазіторый БДПУ